ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
30.11.2021 № 223_____

СТАТУТ
дзяржаўнай установы
”Нацыянальны акадэмічны драматычны
тэатр імя Якуба Коласа“
(новая рэдакцыя)

УСТАВ
государственного учреждения
”Национальный академический драматический
театр имени Якуба Коласа“
(новая редакция)

Віцебск
2021

ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Сапраўдны статут з’яўляецца новай рэдакцыяй статута дзяржаўнай установы ”Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа“, зарэгістраванага рашэннем Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ад 20 сакавіка 2012 г. у адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрамальнікаў за № 300203648.

2. Дзяржаўная ўстанова ”Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа“ (далей – тэатр) з’яўляецца некамерцыйнай, тэатральна-відовішчнай арганізацыяй.

Тэатр пачаў дзейнасць як Беларускі дзяржаўны тэатр – 2 на падставе рашэння Беларускага ўрада 21 лістапада 1926 года.

За дасягненні у развіцці нацыянальнай культуры тэатру 21 снежня 1944 года прысвоена імя Якуба Коласа і тэатр стаў называцца ”Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Якуба Коласа“.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 13 кастрычніка 1976 г. № 4608-1Х за заслугі ў развіцці савецкага тэатральнага мастацтва тэатр узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Загадам Міністэрства культуры СССР ад 7 снежня 1977 г. № 990 тэатр перайменаваны ў Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа.

На падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 жніўня 2001 г. № 1297 тэатру нададзены статус ”Нацыянальны“.

3. Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і заснавальнікам тэатра з’яўляецца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (далей – Заснавальнік).

Поўная назва тэатра:

на беларускай мове – дзяржаўная ўстанова ”Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа“;

на рускай мове – государственное учреждение ”Национальный академический драматический театр имени Якуба Коласа“.

Скарочаная назва тэатра:

на беларускай мове – Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа;

на рускай мове – Национальный академический драматический театр имени Якуба Коласа.

4. Тэатр ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, іншымі актамі заканадаўства і сапраўдным статутам.

5. Тэатр з’яўляецца юрыдычнай асобай, мае адасобленую маёмасць на праве аператыўнага кіравання, можа ад свайго імя набываць маёмасныя і асобныя немаёмасныя правы, быць істцом і адказчыкам у судзе, мае

самастойны баланс, мае права адкрываць разліковыя і іншыя рахункі ў банках, мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і сваім найменнем, штампы, фірменны бланк, эмблему, лагатып.

6. Уласнікам маёмасці, замацаванай за тэатрам, з’яўляецца Рэспубліка Беларусь.

7. Месца знаходжанне тэатра:

Рэспубліка Беларусь, 210026, г. Віцебск, вул. Замкавая, 2.

8. Тэатр у двухмесячны тэрмін уносіць у сапраўдны Статут змяненні і (або) дапаўненні і прадстаўляе іх ва ўстаноўленым парадку для дзяржаўнай рэгістрацыі ў выпадках:

змены ўласніка маёмасці;

змены свайго наймення.

9. Тэатр на працягу дзесяці рабочых дзён з дня змены свайго месцазнаходжання накіроўвае ў рэгіструючы орган апавяшчэнне па форме, устаноўленай Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

10. Тэатр на працягу дзесяці рабочых дзён з дня прызначэння (замены) кіраўніка прадстаўляе ў рэгіструючы орган па месцы знаходжання адпаведнае апавяшчэнне аб прызначэнні (замене) кіраўніка па форме, устаноўленай Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

11. У склад тэатра ўваходзяць структурныя падраздзяленні. Парадак дзейнасці структурных падраздзяленняў вызначаецца адпаведнымі палажэннямі, якія зацвярджае дырэктар.

12. Рэарганізацыя і (або) ліквідацыя тэатра ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 2
МЭТЫ І ПРАДМЕТ ДЗЕЙНАСЦІ ТЭАТРА

13. Асноўнымі мэтамі тэатра з’яўляецца:

забеспячэнне патрэб дзяржавы ў захаванні культурных традыцый беларускага народа;

развіццё творчых прынцыпаў нацыянальнага сцэнічнага мастацтва ў сучасных умовах;

стварэнне спектакляў, якія закранаюць фундаментальныя праблемы духоўнага жыцця людзей, пастаноўкі нацыянальнай і сусветнай класікі;

садзейнічанне далучэнню гледача да гісторыі сусветнага мастацтва, рэалізацыі патрэб асобы ў духоўным, культурным і маральным удасканальванні;

стварэнне ўмоў для ўзаемаразвіцця еўрапейскіх культур, фарміраванне агульнаеўрапейскай культурнай прасторы.

14. Асноўным відам дзейнасці тэатра з’яўляецца тэатральная дзейнасць.

Прадметам дзейнасці тэатра ў адпаведнасці з агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь ОКРБ 005-2011 ”Виды экономической деятельности“, зацверджаным пастановай Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь ад 5 снежня 2011 г. № 85, з’яўляюцца:

творчая дзейнасць і забавы (код – 90);

дзейнасць у сферы выканальніцкіх мастацтваў

(код – 90010);

адукацыя ў галіне культуры (код – 85520);

дзейнасць па паказе кінафільмаў (код – 59140);

здача ў наём уласнай і арандаванай нерухомай маёмасці (код – 68200);

арэнда і лізінг іншых машын, абсталявання і матэрыяльных актываў, не ўключаных у іншыя групоўкі (код – 77390);

рознічны гандаль іншымі таварамі ў палатках, кіёсках і на рынках (код – 47890);

дзейнасць грузавога аўтамабільнага транспарту (код – 49410);

прадастаўленне паслуг па пераезду (перамяшчэнню) (код – 49420);

арэнда і лізінг іншых прадметаў асабістага спажывання і бытавых тавараў (код – 77290);

дзейнасць, якая спрыяе правядзенню культурна-відовішчных мерапрыемстваў (код – 90020);

іншыя віды выдавецкай дзейнасці, не ўключаныя ў іншыя групоўкі (код – 58199);

мастацкае і літаратурная творчасць (код – 90030).

15. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 2010 г. № 450 ”О лицензировании отдельных видов деятельности“ тэатр здзяйсняе наступныя ліцэнзаваныя віды дзейнасці:

ахоўная дзейнасць;

дзейнасць па забеспячэнні пажарнай бяспекі;

дзейнасць у галіне аўтамабільнага транспарту.

Права тэатра ажыццяўляць дзейнасць, на заняцце якой неабходна атрыманне ліцэнзіі, узнікае з моманту атрымання такой ліцэнзіі або ва ўказаны ў ёй тэрмін і спыняецца па заканчэнні тэрміну яе дзеяння, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

ГЛАВА 3
ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ТЭАТРА

16. Для дасягнення пазначаных у главе 2 сапраўднага статута мэтаў і ажыццяўлення прадмета дзейнасці тэатр мае права:

арганізоўваць і правадзіць тэатральную дзейнасць у рэспубліцы і за яе межамі шляхам прамых сувязей з тэатральна-відовішчнымі і іншымі арганізацыямі;

экспарт і імпарт паслуг у сферы артыстычнага і культурнага абмену;

свабоднага ажыццяўлення творчай дзейнасці;

самастойнасці ў выбары мастацкіх накірункаў, рэпертуару, у прыняцці рашэнняў аб публічнай дэманстрацыі спектакляў, у падрыхтоўцы і публікацыі рэкламных матэрыялаў;

ствараць філіялы, прадстаўніцтвы;

з дазволу Заснавальніка быць удзельнікам гаспадарчых таварыстваў;

ажыццяўляць знешнеэканамічную дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

заключаць здзелкі з фізічнымі і юрыдычнымі асобамі ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы. Атрыманыя ад такой дзейнасці даходы і набытая за кошт іх маёмасць паступаюць у самастойнае распараджэнне тэатра.

17. Тэатр не мае права выступаць у якасці гаранта, паручыцеля трэціх асоб – юрыдычных асоб недзяржаўнай формы ўласнасці (у тым ліку долі (акцыі) ва ўстаўных фондах якіх знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці) і фізічных асоб (у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў) па выкананні гэтымі асобамі сваіх абавязкаў па вяртанні крэдытаў, выдзеленых банкамі і небанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі, за выключэннем крэдытаў, якія выдаюцца на будаўніцтва жыллёвых памяшканняў, калі іншае не пастаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 4
МАЁМАСЦЬ І ФІНАНСАВАННЕ ТЭАТРА

18. Маёмасць тэатра складаюць асноўныя фонды і абаротныя сродкі, а таксама іншыя каштоўнасці.

19. Маёмасць тэатра знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь і замацоўваецца за тэатрам на праве аператыўнага кіравання.

20. Крыніцамі фарміравання маёмасці тэатра з’яўляюцца:

бюджэтныя сродкі;

даходы, атрыманыя ад дзейнасці, якая прыносіць даход;

іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

21. Тэатр у адносінах да замацаванай за ім маёмасці ажыццяўляе ў межах, вызначаных заканадаўствам, у адпаведнасці з мэтамі сваёй дзейнасці, заданнямі Заснавальніка і прызначэннем маёмасці, правы валодання і распараджэння гэтай маёмасцю.

22. Тэатр не мае права без згоды Заснавальніка адчуджаць або іншым чынам распараджацца замацаванай за ім на праве аператыўнага кіравання маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт сродкаў, выдзеленых яму, калі іншае не вызначана заканадаўчымі актамі.

23. Тэатр ва ўстаноўленым парадку па ўзгадненні з Заснавальнікам, мае права здзяйсняць здзелкі па распараджэнні маёмасцю, якая знаходзіцца ў аператыўным кіраванні.

ГЛАВА 5
КІРАВАННЕ ТЭАТРАМ

24. Выканаўчым органам тэатра з’яўляецца дырэктар. Дырэктар тэатра наймаецца на пасаду па кантракту Заснавальнікам з ліку асобаў, якія маюць неабходную кваліфікацыю.

25. Дырэктар тэатра:

забяспечвае выкананне планаў дзейнасці тэатра;

нясе адказнасць за арганізацыю творчай працы, высокі ідэйны і мастацкі ўзровень спектакляў, канцэртных праграм і створаных у тэатры п’ес;

наймае і звальняе работнікаў тэатра згодна з умовамі працоўных дагавораў (кантрактаў) і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь (прыём на работу і звальненне мастацкага кіраўніка (галоўнага рэжысёра), намеснікаў кіраўніка і галоўнага бухгалтара, кіраўніка кадравай службы, здзяйсняецца па ўзгадненню з Заснавальнікам);

дзейнічае без даверанасці ад імя тэатра, прадстаўляе тэатр ў дзяржаўных органах Рэспублікі Беларусь і стасунках з фізічнымі і юрыдычнымі асобамі;

у межах заканадаўства Рэспублікі Беларусь і сапраўднага статута распараджаецца сродкамі тэатра;

заключае дагаворы ад імя тэатра;

адкрывае ў крэдытных арганізацыях разліковы і іншыя рахункі;

у адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь і Правіламі ўнутранага працоўнага распарадку прымае меры заахвочвання і дысцыплінарнага спагнання да работнікаў тэатра;

выдае даверанасці;

выдае загады і аддае распараджэнні, абавязковыя для выканання ўсімі работнікамі тэатра;

зацвярджае структуру і штатны расклад тэатра;

вызначае ва ўстаноўленым парадку ўмовы аплаты працы супрацоўнікам тэатра;

адказвае перад Заснавальнікам у адпаведнасці з умовамі кантракта;

выконвае іншыя абавязкі, прадугледжаныя заканадаўствам, кантрактам.

27. Дзейнасць дырэктара тэатра можа правярацца ў парадку, устаноўленным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

28. У Тэатры ствараецца мастацкі савет, які мае статус дарадчага органа тэатра. Мастацкі савет з’яўляецца пастаянна дзеючым фарміраваннем, якое ствараецца з мэтай забяспячэння ўдзелу калектыва ў вырашэнні ўсіх творчых задач і функцый тэатра.